**Этноэкологический материал модуля «Неживая природа»**

**(учебный предмет «Человек и мир», 1 класс)**

| Используемый источник | Этноэкологическое содержание модуля «Неживая природа» |
|---|---|
| Загадкі / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: «Навука і тэхніка», 1972. – 448 с. [3] | Вышэй лесу, краша пламя. (Сонца, с. 22.)<br>Мяне рэжуць, мяне б'юць, а я за гэта не злюсь, яшчэ лепей станаўлюсь. (Глеба, с. 30.)<br>У полі без кораня расце. (Камень, с. 31.)<br>У полі салавей свішча. (Вецер, с. 42.)<br>І спім, і ядзім, і ходзім, самі бяром, а людзям не даём. (Паветра, с. 53.)<br>Я іду, іду, ніколі да стога не дайду. (Туман, с. 53.)<br>Белае палатно, а пад ім холадна. (Снег, с. 51.)<br>З неба ўпаў, усю зямлю, як абрусам заслаў. (Снег, с. 51.)<br>Ляцеў птах, сеў на вадах, ваду ўскалыхнуў і сам патануў. (Сняжынка, с. 49.)<br>Без рук расце, без зубоў кусае. (Мароз, с. 48.)<br>Вечарам прыляціць, усю ноч на зямлі праляжыць, а раніцай на неба апяць паляціць. (Раса, с. 45.)<br>Рассыпаўся гарох на сто дарог, ніхто не падбярэ: ні цар, ні царыца, ні красная дзявіца. (Град, с. 45.)<br>Чырвонае карамысла праз рэчку павісла. (Вясёлка, с. 44.)<br>Адзін лье, другі п'е, трэці расце. (Дождж, зямля, трава, с. 44.)<br>Чакаем і просім усе, а прыйдзе – усе схаваемся. (Дождж, с. 44.)<br>Пушыстая вата плыве куда-та. (Воблака, с. 43.) |

| | |
|---|---|
| | Без крыл, а ляціць, без ног, а ходзіць, без паруса, а плыве. (Хмара, с. 42.)<br>Бяжыць ліска каля лесу блізка. (Маланка, с. 40.)<br>Нахмурыцца, насупіцца, у слёзы ударыцца – нічога не застанецца. (Навальніца, с. 39.)<br>Стукае, грукае – нідзе яго не знойдзеш. (Гром, с. 39.) |
| Загадкі / склад. А. І. Гурскі. – Мінск: «Нар. асвета», 1969. – 48 с. [4] | Глянь праз акно – відаць сіняе палатно. (Неба, с. 7.)<br>Свечак многа гарыць, а ніводнай не патушыць. (Зорка на небе, с. 7.)<br>Усіх нас корміць, а сама есці не просіць. (Зямля, с. 8.)<br>Ні рук, ні ног не мае, а яблыкі страсае. (Вецер, с. 9.)<br>Вее, сее, рассявае, зімой сляды замятае. (Завіруха, с. 11.) |
| Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі / Укл. і рэд. Н. С. Гілевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1983. – 350 с. [5] | Па саломе ідзе, не шастае, па вадзе ідзе, не плюхае. (Сонца, с. 329.)<br>Усё поле ў клубочках. (Камяні, с. 329.)<br>Мяне ніхто не відзіці, але ўсякі чуе, а верную спутніцу маю ўсякі відзіць і ніхто не чуе. (Гром і маланка, с. 330.) |
| Васілевіч, У. Ад парога у свет дарога: народныя прыкметы і павер'і / У. Васілевіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2017. – 126 с. [6] | Калі ўвосень выпадзе першы снег, праз месяц выпадзе другі, і гэты ўжо будзе трымацца ўсю зіму, с. 92.<br>Калі ўвосень шмат лятае павуціння, то вясна будзе цёплая, с. 87.<br>Калі вясна вельмі ранняя ды цёплая, то будзе халодны травень, с. 84.<br>Калі ўвесну шмат лятае павуціння, то восень будзе халодная, с. 87. |

| | |
|---|---|
| | Калі ўвесну першы раз загрыміць, а ўжо нідзе няма снегу, то будзе цёплае лета і добры ўраджай, с. 89.<br>Калі няма расы ўвечары, уначы, уранку, то неўзабаве дождж пойдзе, с. 90. |
| Рапановіч, Я. Н. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / Я. Н. Рапановіч. – Мінск: Вышэйш. школа, 1974. – 384 с. [7] | Вясной дажджы не лішнія, с. 216.<br>Вясной караб вады – коўш гразі, а восенню коўш вады – караб гразі, с. 216.<br>Зіма снежная – лета дажджлівае, с. 219.<br>Красна восень снапамі, а зіма ўмалотам, с. 222.<br>Летні дзень – год корміць, с. 223. |
| Шумский, К. А. Народные экологические знания белорусов: традиции и современность / К. А. Шумский. – Мінск: Беларуская навука, 2021. – 367 с. [2] | Калі першы гром пачуецца з поўначы, то лета будзе халоднае; з поўдня – цёплае, с.326.<br>Калі першы снег выпадзе рана, то вясна мокрая, с. 326.<br>Зіма ідзе па лету, а лета па зіме: калі стаіць роўная зіма, то будзе добрае лета, с. 330.<br>Калі першы снег застане на дрэвах лістоту, то будучая вясна будзе халоднай, с. 332. |
| Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар; пер. з рус. мовы, літ. апрац. і навук. рэд. Я. М. Сахуты. – 4-е выд. – Мінск: Беларусь, 2023. – 224 с. [8] | Народная вясенняя песня «Прачнулася сонца рана…»<br>Прачнулася сонца рана, дзянніцай,<br>Умылася янтарнай расіцай,<br>Клікнула спазаранку красную дзявіцу,<br>Зару-зарніцу:<br>«Ляці на быстрых крыллях<br>Быстрэй ветру буйнага,<br>Нясі вестачку мацеры-зямліцы: |

| | |
|---|---|
| | Напаю зямліцу чыстай вадзіцай,<br>Сагрэю цёплым спарэннем,<br>Асвячу яркім праменнем,<br>Асвабаджу маці-зямліцу<br>Ад лютых марозаў.<br>Прачніся, прачніся, маці-зямліца,<br>Хай чячэ вадзіца,<br>Хай адкрываецца крыніца,<br>Хай расце траўка-мураўка,<br>Хай цвітуць сады-прысады,<br>хай спеюць вішні-вінаграды».<br>Маці-зямля прачнулася,<br>Яснаму сонцу ўсміхнулася,<br>Нізка светламу пакланілася, сонцу яснаму павінілася, с. 63. |